комплекснага развіцця ў сабе як прадуктыўных, так і рэпрадуктыўных здольнасцей. Важнейшая педагагічная задача - забеспячэнне неабходных умоў для развіцця тых і другіх.

Методыка навучання імправізацыі павінна грунтавацца на сістэме метадаў. Галоўнымі сярод іх мы лічым рацыянальны метад і метад свабоднага самавыяўлення. Першы з іх (рацыянальны) накіраваны пераважна на фарміраванне рэпрадуктыўных здольнасцей музыканта і зводзіцца да спасціжэння ім багацця сусветнай музычнай культуры, сродкаў музычнай выразнасці, спосабаў адлюстравання ў музыцы тых ці іншых прадметаў і з'яў.

Асноўнай мэтай метаду свабоднага самавыяўлення з'яўляецца далучэнне навучэнца да «жывога» музіцыравання, фарміраванне ў яго патрэбнасцей і здольнасцей да перадачы ўласнага светапогляду, уласных думак і пачуццяў на мове музыкі. Галоўная псіхолага-педагагічная цяжкасць - пераарыентацыя свядомасці навучэнцаў на разуменне музыкі не толькі як аб'ектыўна існуючай данасці ў выглядзе разнастайных музычных твораў, але і як сродку камунікацыі і самавыяўлення асобы.

Асаблівасць метаду свабоднага самавыяўлення заключаецца ў тым, што музыкант у большай ступені, г.зн. без усякіх абмежаванняў (ці з мінімальнымі абмежаваннямі), у працэсе музіцыравання можа рэалізаваць сваю мастацкую накіраванасць. Адсутнасць узору ці алгарытму дзеяння, як гэта мае месца ў рамках рацыянальнага метаду навучання, забяспечвае шырокую прастору для творчага пошуку.

У рамках метаду свабоднага самавыяўлення можна акрэсліць некалькі накірункаў.

1. Жанравая імправізацыя. У даным выпадку ад музыканта патрабуецца захаванне найбольш тыповых жанравых адметнасцей, да якіх можна аднесці характар, метр, рытм.

2. Стылізацыя. Матэрыялам для стылізацыі можа быць той ці іншы накірунак або жанр музычнага мастацтва, таксама творчасць асобнага кампазітара ці канкрэтны музычны твор.

3. Імправізацыя як працяг заданага музычнага ўрыўка. Гэта можа быць частка музычнага твора ці «хатняя загатоўка» выкладчыка або навучэнца. Асабліва эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне гутаркі ў вучэбным дыялогу па прынцыпу «пытанне - адказ».

4. Стварэнне ігравых сітуацый. Напрыклад, сумеснае музіцыраванне на падставе выкарыстання кантрастных вобразаў у іх супастаўленні.

5. Імправізацыя на нязменнай гарманічнай аснове. Займацца ёю лепш у ходзе сумеснага музіцыравання або з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў навучання.

6. Імправізацыя на вобразнае заданне. У якасці вобраза могуць выступаць літаратурны сюжэт, мастацкая рэпрадукцыя, музычны твор і інш.

7. Імправізацыя як выяўленне ўласнага эмацыянальнага настрою.

Метад свабоднага самавыяўлення, безумоўна, не абмяжоўваецца гэтымі накірункамі, і кожны выкладчык можа і павінен самастойна весці пошук шляхоў, якія дазваляюць найбольш эфектыўна развіваць творчы патэнцыял асобы навучэнца.

Валасюк Л.К.,
дацэнт

## АСАБЛІВАСЦІ ЗМЕСТУ КУРСА «МЕТОДЫКА РАБОТЫ З АНСАМБЛЕМ»

Адкрыццё новай спецыяльнасці «кіраўнік ансамбля народных інструментаў» (вельмі патрэбнай у сучасны час у галіне культуры) запатрабавала ад выкладчыкаў новых намаганняў, прафесійных ведаў па мадэліраванню будучага спецыяліста данага накірунку. Былі распрацаваны патрабаванні па класу ансамбля па семестрах і да дзяржаўных іспытаў. Ансамблі фарміраваліся са студэнтаў аднаго курса і ў такім выглядзе даходзілі да дзяржаўных іспытаў. Нельга было зрабіць адзіны тып ансамбля для ўсіх курсаў як па колькасці ўдзельнікаў, так і па складу. Таму з'явілася шмат ансамбляў розных складаў і накірункаў. Галоўным патрабаваннем да навучання і практычнай дзейнасці ансамбляў тое, што студэнты павінны самі складаць рэпертуар і агучваць яго: інструментоўкі, аранжыроўкі, апрацоўкі, сачыненні разнастайных твораў. Студэнт атрымаў магчымасць на практыцы рэалізаваць свае творчыя здольнасці і задумы. У ансамблі студэнт - творца. Практыка паказала: абраны шлях вельмі цікавы і дапамагае раскрываць студэнта ўсебакова.

Для забеспячэння студэнтаў тэарэтычнымі ведамі, метадамі работы ў ансамблі быў распрацаваны лекцыйны курс «Методыка работы з ансамблем», які дынамічна развіваецца і абагачаецца практыкай.

Тэматычны план названага курса вельмі разнастайны. Асаблівасці яго зместу - глыбокая ўзаемасувязь тэарэтычных пытанняў з практычнымі. У ліку іх такія пытанні, як гісторыя развіцця ансамбляў народных інструментаў; ансамблі народных інструментаў у Беларусі (іх характарыстыка, рэпертуар, творчы партрэт); сучасныя ансамблі; працэс фарміравання мастацкіх калектываў; саставы ансамбляў; асаблівасці дзейнасці кіраўніка самадзейнага калектыву і інш.

Вялікая ўвага надаецца метадычным пытанням: методыка вучэбнага працэсу; методыка

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

правядзення індывідуальных і групавых заняткаў; методыка падбору вучэбнага і канцэртнага рэпертуару; методыка работы на пачатковым этапе навучання; методыка работы над музычным творам у класе ансамбля; асноўныя метады работы ў ансамблі; развіццё навыкаў ігры ў ансамблі; методыка арганізацыі і правядзення рэпетыцый у ансамблі; работа з салістамі; асаблівасці работы над акампанементам і інш. Гэтыя пытанні разглядаюцца вельмі падрабязна і ўключаюць, напрыклад, работу над фразіроўкай, агогікай, тэмпам, артыкуляцыяй, дынамікай, аплікатурай. Разглядаюцца яны і на практычных занятках.

Блок пытанняў, звязаных з практычным засваеннем іншых інструментаў, - асаблівасць практычнай дзейнасці кіраўніка. Ен павінен ведаць прыемы ігры і спосабы гукаўтварэння на інструментах домравай групы, цымбальнай групы, балалаечнай групы, на баяне, гармоніку, дудцы. Кіраўніку ансамбля неабходна не толькі тэарэтычна ведаць, як іграць, але і добра валодаць ігрой на розных інструментах. Раней была такая дысцыпліна, як «Вывучэнне аркестравых інструментаў», але ў новых планах яна не знайшла месца. Лічым неабходным увесці гэту дысцыпліну ў план для больш якаснай падрыхтоўкі студэнтаў.

Кіраўнік калектыву, засвоіўшы пэўную суму метадаў, прыемаў, формаў работы з калектывам, павінен у працэсе сваей творчай дзейнасці сістэматычна іх удасканальваць, шукаць новыя метады, прыёмы, формы, якія забяспечвалі б максімальную эфектыўнасць затрачаных намаганняў. Дабівацца гэтага можна па-рознаму: чытаць спецыяльную літаратуру, праходзіць курсы па павышэнню кваліфікацыі, аналізаваць методыку работы з самадзейнымі калектывамі, працуючымі ў іншых жанрах мастацкай творчасці (харавыя, танцавальныя, тэатральныя і іншыя); вывучаць методыку навучання ігры на такіх інструментах, як скрыпка, фартэпіяна, методыку, якая мае багатыя традыцыі і знайшла адлюстраванне ў вялікай колькасці кніг і артыкулаў. Значныя патэнцыяльныя магчымасці ўдасканалення методыкі закладзены ў крытычным аналізе асабістага вопыту, а таксама вопыту работы кіраўнікоў прафесійных калектываў.

Усе гэта дае магчымасць для ўдасканалення вучэбна-творчай і музычна-выхаваўчай работы з калектывам. Таму адным з асноўных шляхоў паляпшэння гэтай работы ў калектывах з'яўляецца глыбокае вывучэнне будучымі кіраўнікамі ансамбляў методыкі работы з ансамблем з моманту яго арганізацыі да правядзення канцэртных выступленняў.

Мішуроў Г.С.,
прафесар

## НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЕ ВЫКАНАННЕ Ў АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАХ

Разглядаючы праблемы народна-інструментальнага выканання ў Беларусі, неабходна звярнуць пільную ўвагу на тры асноўныя аспекты, якія непасрэдна звязаны з этнаграфічнымі асаблівасцямі фальклору, падрыхтоўкай кадраў і выбарам беларускіх народных інструментаў.

Маладаследаванымі застаюцца формы папулярызацыі народнай мастацкай культуры прафесійнымі і самадзейнымі калектывамі. Мы маем на ўвазе дэманстрацыю на сцэне «жывога» фальклору, яго эстэтыку, ступень і крытэрыі апрацоўкі фальклору, эвалюцыю жанравага спектру, стварэнне традыцыйнага музычнага інструментарыя. Думаецца, што ў гэтай сувязі этнографам і фалькларыстам не трэба абмяжоўвацца толькі вывучэннем вытокаў жанравых сістэм, фальклорнай сюжэтнасцю, асаблівасцямі функцыяніравання народных ўяўленняў, свят і абрадаў, а пажадана сканцэнтраваць сваю ўвагу на спецыфічных працэсах і практычнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў аматарскіх калектывах народна-інструментальнага выканання Беларусі.

Калі на эстрадзе не ўлічваецца этнаграфічная асаблівасць фальклору выконваемага твора (асабліва жывога бытавання), то ен губляе сваю сутнасць, не набывае народнага прызнання і ўспрымаецца як стылізацыя. І адначасова кожны ўдала адабраны элемент народнай эстетыкі спрыяе стварэнню непасрэднага нацыянальнага каларыту.

Праблемы падрыхтоўкі кіраўнікоў народна-інструментальных ансамбляў патрабуюць асаблівага даследавання. Таму лічым неабходным спыніцца на пытаннях падрыхтоўкі і выхавання кадраў для разнастайных па складу чыста фальклорных (этнаграфічных) і трансфармаваных ансамбляў народных інструментаў Беларусі.

Адна з асноўных задач - падрыхтаваць не толькі прафесіянала-кіраўніка, але і перш за ўсе такога спецыяліста, які б беражліва захоўваў і працягваў прапагандаваць народныя традыцыі інструментальнага выканання. Аднак аналізуючы вытокі падрыхтоўкі кадраў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Беларусі, трэба заўважыць, што да гэтай пары, акрамя кафедраў народна-інструментальнай творчасці і харавых народных спеваў Беларускага універсітэта культуры, вопыту ў падобным накірунку не было. Толькі ў некаторых музычных установах у вучэбныя планы ўключаны дысцыпліны фальклорнага цыкла без выхаду на дзяржаўны экза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ